Прачытай сам і перадай другому.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

№ 94 (4552)

27 лістапада 2020 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

АКАЯННЫЯ ДНІ

Больш за 4000 заяў падалі ў апошнія месяцы грамадзяне Беларусі па фактах забойстваў, гвалту і катаванняў. Калі ж адпаведныя праваахоўныя органы пральюць святло на тое, што адбылося і адбываецца ў краіне?

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

Светлана КАЛИНКИНА

Пришла беда. Большая беда

Как в капле воды отражается солнце, так в этом уголовном деле, рассмотренном в районном суде Солигорска, высветилась большая белорусская трагедия.

Сторонник Александра Лукашенко 67-летний военный пенсионер, бывший охранник местного КГБ Леонид Штайда убил противника Лукашенко, 50-летнего рабочего «Беларуськалия» Геннадия Киселя. Мужчины не были лично знакомы, но по поводу действующего главы Беларуси вели жесткую дискуссию в социальных сетях. Расхождения во взглядах оказались настолько серьезными, что при случайной личной встрече после президентских выборов, 12 августа этого года, Штайда засадил в горло Киселю садовые ножницы. Мужчину спасти не удалось.

Пока это единственное расследованное и доведенное до суда уголовное дело, возбужденное по факту убийства на политической почве. И можно не сомневаться – только потому, что Штайда уже отставник и не имел приказа «Пленных не брать!». Приговор – 10 лет лишения свободы. Такая вот ирония судьбы: когда после выборов одни шли под дубинки ОМОНа и спецназа, отстаивая свое право на свободу, Штайда, получилось, сражался за свою тюрьму и скудную тюремную пайку.

Рыдает вдова погибшего, потому что, прожив всю сознательную жизнь за мужем, теперь не знает, что ей дальше делать одной. Рыдает и просит простить жена убийцы – потому что вообще-то он тихий и спокойный человек, но горяч в вопросах политики. Плачут дети, потому что у одних отец оказался в могиле, у других – в тюрьме. Горе – у всех.

Может, Лукашенко счастлив, что у него все-таки есть сторонники?

Может, счастливы Муковозчики и Азаренки – пропагандисты, вещающие, что против Лукашенко выступают только враги, наркоманы и проститутки, и наконец получившие доказательство, что им кто-то поверил?

Может, счастлив председатель КГБ, потому что это в его ведомстве нашелся отставник, готовый защищать Александра Лукашенко даже садовыми ножницами?..

Моей фантазии не хватает, чтобы придумать, кто может радоваться произошедшему. Я считаю, что уголовное дело, рассмотренное в районном суде Солигорска, показывает, что в нашей стране беда. Большая, очень большая беда! Страшная беда! Лукашенко и его опричники так старательно защищают свое желание оставаться у власти, что довели общество до раскола, вражды, убийств. Видимо, забыли библейскую мудрость: «Кто сеет ветер, тот пожнет бурю». А значит, ведут Беларусь к большой трагедии, к катастрофе, когда идет брат на брата, отец – на сына, сын – на отца, сосед – на соседа.

Сколько трагедий должно случиться, чтобы власть поняла, что собственный народ недопустимо делить на «своих» и врагов»? Сколько смертей должно произойти? Сколько пролиться слез?

О чем думает человек, понимая, что все это происходит из-за него?

Что чувствует тот, из-за кого уже гибнут люди? Из-за кого остаются калеками. Из-за кого остаются сиротами, вдовами… Из-за кого хоронят своих детей. Из-за кого сходят с ума, ничего не зная о судьбе близких. Из-за кого одни седеют от боли и ужаса, другие звереют от любви и преданности.

Что ему снится? Как ест власть ложками, черпаками, бадьями – с азартом, аппетитом – и не поперхнется, и не подавится? Или, наоборот, как без власти, голодный бродит по своей стране, но никто даже хлеба не подаст – перед носом закрывают двери, будто перед прокаженным?

Какому Богу он молится? Молоху – языческому божеству, требующему человеческих жертв? Или все-таки ежедневно и еженощно вымаливает у христианского Бога: «Прости меня, грешного»?

Чем он оправдывает себя, когда остается один, без телекамер, без публики, без необходимости врать? Чем он себя утешает?..

Он понимает, что объявленная победа на президентских выборах – от слова «беда»?

Он понимает, что может вернуть белорусам нормальную жизнь за одну минуту, даже за полминуты, объявив о своей отставке?

Оно того стоит? Президентское кресло, которое шатается от проклятий людей. Пышные резиденции, в которые сквозь кордоны и стены просачивается ненависть собственного народа. Многочисленная челядь, услужливая и согласная, но уже не умеющая скрыть животный страх...

Она того стоит – власть, удерживаемая тюрьмами, пытками, смертями и кровью?

РЕПЛИКА

«Танец» Дыско

25 ноября на телеканале «СТВ» вышло очередное «расследование» Григория Азарёнка. Слово «расследование» я беру в кавычки, поскольку очевидно, что имеем дело не с расследованием, а со «сливом», касающимся обстоятельств, сложившихся после гибели Романа Бондаренко, о которой наша газета уже писала. Причем со «сливом» достаточно грязным.

К жанру «слива» показанный видеоматериал относится уже потому, что большинство его составляющих – кроме тех фрагментов, в которых Григорий Азарёнок выступает в качестве подставки для микрофона, – журналист не может получить, не совершив при этом уголовно наказуемого преступления.

Он не может самостоятельно организовать прослушку телефонов родственников погибшего гражданина Бондаренко – а трансляция записей такого рода составляет не меньше трети эфирного времени.

Он не может самостоятельно проникнуть в учреждение предварительного заключения, чтобы взять комментарий у арестованного врача Больницы скорой медицинской помощи Артема Сорокина, обвиняемого в разглашении врачебной тайны: передал сотруднице портала *www.tut.by* Екатерине Борисевич копию заключения о том, что в крови убитого гражданина Бондаренко не содержалось этанола (стало быть, он был трезв).

Единственное, что мог сделать Григорий Азарёнок, не появляющийся, правда, именно в этот момент в кадре, – это взять комментарий у заместителя генерального прокурора Республики Беларусь Геннадия Дыско.

И вот на этом стоит остановиться особо.

Я имею в виду – на комментариях государственного советника юстиции 3-го класса Г.И.Дыско.

Заместитель генерального прокурора сообщил общественности, почему именно возбуждено уголовное дело, в котором в качестве подозреваемых фигурируют граждане Сорокин и Борисевич. Объяснил подробно и внятно. Но при этом он ни слова не сказал о том, возбуждено ли уголовное дело по факту убийства гражданина Бондаренко. А ведь именно убийство является наиболее важным фактором, побудившим минчан к новому всплеску («затухающему» – как выразился другой высокопоставленный участник этого же видео) возмущения и противостояния.

Напомним: 31-летний Роман Бондаренко был похищен неизвестными в штатском во дворе дома, в котором он проживал. Момент похищения был зафиксирован на телефонах случайных свидетелей – причем, насколько можно судить, драки при этом не было. Значит, похищен Бондаренко был живым и здоровым, после чего его привезли в Больницу скорой медицинской помощи с травмами, не совместимыми с жизнью. Чем не повод для немедленного возбуждения уголовного дела?

Возможно, Геннадия Иосифовича Дыско не спрашивали о том, возбуждено ли дело по данному поводу. Возможно, собеседник просто вырезал соответствующий фрагмент комментариев заместителя генерального прокурора из финального варианта своего, мягко говоря, «произведения». Не берусь утверждать даже, что дело не возбуждено. Но факт остается фактом: Генеральная прокуратура на момент написания данного текста нигде публично, устами своих полномочных представителей, тем более столь высокопоставленных, как Геннадий Дыско, не заявляла о том, что оно возбуждено.

Хотя, как мне кажется, именно убийство в центре Минска безоружного человека должно в первую очередь волновать наши правоохранительные органы. Ибо они должны защищать не только букву закона, но и жизнь каждого отдельно взятого гражданина.

Осознание данной задачи, к сожалению, генерал Дыско и Генеральная прокуратура в целом не демонстрируют. То есть дело по поводу укуса за ногу экипированного омоновца, совершенного безоружной женщиной, возбуждается практически немедленно, о чем сообщается громогласно. А о деле по поводу убийства Бондаренко… Не врач и журналистка ведь в убийстве виноваты, правда? Тогда – кто?

И вот в момент, когда хочется получить ответ на этот вопрос, правоохранительная система начинает исполнять словесный танец в стиле «диско». Или – «поп». Или даже – «брейк», изворачиваясь, чтобы не дать ответа на этот вопрос. А ведь господин Лукашенко обещал: нам расскажут об этом! Причем – правду расскажут!

Ждем. Пока наблюдаем за «танцами» г-на Дыско и других. Может быть, профессионализм все-таки даст о себе знать и о возбуждении уголовного дела по факту убийства Романа Бондаренко нам расскажут. Ждем, надеемся. Насчет веры, увы, сказать нечего.

Александр ФЕДУТА.

(Продолжение темы на 3-й стр.)

ПОСТСКРИПТУМ

Непонятные тезисы Лаврова

Состоялся визит в Минск министра иностранных дел России Сергея Лаврова. Он принял участие в совместном заседании коллегий внешнеполитических ведомств Беларуси и России, а также отдельно встретился со своим коллегой Владимиром Макеем и с Александром Лукашенко.

Вот некоторые тезисы, которые озвучил С.Лавров.

– В соответствии с принципом взаимности мы расширили наш ответный стоп-лист, включили в него представителей стран ЕС, которые активно участвуют в санкционном ажиотаже. Отмечаем и оперативность белорусских коллег в принятии своих ответных мер. Как вы знаете, с 2015 года у нас стоп-листы единые, поэтому соответствующая координация в рамках Союзного государства отлажена.

То есть, «стоп-лист» у Беларуси и России единый, и попадут в него одни и те же представители Запада. Значит ли это, что Россия вслед за Беларусью готова отказаться от общения со всеми странами Евросоюза, а также США, Великобританией и Канадой, поскольку в «санкционном ажиотаже» участвуют все главы внешнеполитических ведомств этих стран, а также значительная часть парламентариев и глав правительств вплоть до Ангелы Меркель и Эммануэля Макрона? На этот вопрос господин Лавров конкретно ничего не ответил.

– Беларусь – наш союзник, стратегический партнер. Белорусы – братский нам народ. И мы, конечно же, заинтересованы в том, чтобы ситуация в Республике Беларусь была спокойной, стабильной. На наш взгляд, этому, конечно же, будет способствовать начавшаяся по инициативе руководства страны конституционная реформа как важный этап совершенствования преобразований в политической, экономической и правовой системе, как это было объявлено.

Но ведь тема конституционной реформы в Беларуси, похоже, заглохла. И понятно почему: провести прозрачный и честный референдум те, кто удерживает власть, и не захотят, и не смогут. Не подразумевает ли господин Лавров под реформированием Конституции Беларуси полный отказ от ее исполнения? Ведь сегодня властям предержащим проще не исполнять Конституцию вовсе, чем ее реформировать. Или все-таки Россия в столь «изящной» форме напоминает Александру Лукашенко о некоторых обязательствах?

Когда один из журналистов задал вопрос о контактах российской стороны с белорусской оппозицией, последовал такой ответ:

– Хочу коротко ответить на ваш вопрос: это полная ложь.

Если, по Лаврову, у России действительно нет намерения вступать в отношения с белорусской демократической общественностью, то это весьма печально. События, которые происходят в Беларуси, не могут не волновать как европейцев, так и россиян.

Федор КОНСТАНТИНОВ.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ

Протаіерэй ...без Бога ў галаве

Слухаць пропаведзі духоўнага айца Свята-Елісавецінскага манастыра протаіерэя Андрэя Лемяшонка асабліва любяць тыя, каму ў жыцці бракуе пяшчоты бліжніх. Памяншальна-ласкальныя формы – улюбёны прамоўніцкі прыём гэтага царкоўнага дзеяча: *"Будучи в Черногории, я спал на камушках, дабы не изнежиться, в палатке в вагончике, где однажды у меня сгорело всё: денежки, сосудики, святыньки..."* Слухаюць манахіні і манастырскія паслушніцы свайго духоўніка і *умиляются*, усёй душой аддаючыся пад яго клапатлівую апеку.

Праўда, апека тая пры бліжэйшым разглядзе нярэдка прыходзіць у супярэчнасць з хрысціянскімі пастулатамі, найперш з Госпаднімі дзесяццю запаведзямі. Дзве з іх, памятаем, адназначна перасцерагаюць: не забі! не ілжэсведчы! Парушэнне запаведзяў лічыцца смяротным грахом.

Але ці для ўсіх? Падобна на тое, што для протаіерэя Лемяшонка запаведзяў тых наогул не існуе, ён сам сабе ўсталёўвае правілы паводзін ва ўлонні, здавалася б, далёкай ад анархіі праваслаўнай царквы.

Гэтак на нядаўнім манастырскім сходзе (трансляваным анлайн), калі адна з паслушніц расказала пра збітага АМАПАм на вуліцы юнака, якому падчас затрымання зламалі нагу, протаіерэй груба перабіў яе і прачытаў цэлую лекцыю пра палітычную сітуацыю ў Беларусі, якую ён бачыць даволі своеасабліва. Калі змірэнная з выгляду жанчына згадала пра пераслед першых хрысціян, то пачула ў адказ літаральна наступнае: *"Не надо сравнивать христиан с несанкционированным шествием!"*

"Пастырь овец православных" Лемяшонак, відаць, лічыць, што старшыня рымскага выканкама ў Іудзеі Понтый Пілат шторазу выдаваў дазволы на хрысціянскія сходы ў каменяломнях, куды прыхільнікаў новай веры падвозілі на камфартабельных аўтобусах…

А калі відавочна напалоханая грозным воклічам паслушніца ўсё ж асмелілася заікнуцца пра зверствы АМАПа, пра якія ёй расказала маці скалечанага хлопца, то была асаджана яшчэ больш рашучай тырадай протаіерэя: *"А тебе не жалко ОМОН? Настоящие мученики – это ОМОН. Если бы не ОМОН, ты знаешь, что здесь было бы!"*

Вось так з небывалай лёгкасцю афіцыйны прадстаўнік БПЦ далучыў да почату пакутнікаў за веру амапаўцаў, чыя зброя – не крыж і слова Божае, а акрываўленыя дубінкі. Калі гэта не здзек з царквы, не кашчунства над яе святынямі, то – што?

Але асабліва цынічна з вуснаў царкоўнага дзеяча прагучала парада маці збітага… пакаяцца. Пакаяцца перад… АМАПам. За лішнія, так бы мовіць, клопаты. За тое, што сына на няправільны шлях наставіла, пусціла на шэсце. То бок Лемяшонак фактычна апраўдаў гвалт і нявечанні мірных людзей, якія ўжо неаднойчы закончыліся смерцю пацярпелых. І гэта ў час, калі адносна адной з такіх трагедый (смерць Рамана Бандарэнкі) ідзе следства. Нехлямяжа, з няўцямнымі тлумачэннямі, з шантажом і рэпрэсіямі лекара, які абследаваў цела забітага, але – ідзе. Ды тое не хвалюе вольнага ад усіх законаў (свецкіх і царкоўных) протаіерэя. Ён сам сабе закон і сам сабе пры патрэбе грахі адпусціць.

Рахманагалосая паслушніца, аддамо ёй належнае, да апошняга спрабавала апеляваць і да манастырскага духоўніка, і да прысутнай грамады, якая таксама перашкаджала ёй гаварыць. Урэшце ў протаіерэя скончылася цярпенне, і ён проста паслушніцу… паслаў. Літаральна сказаў: *"Пошла ты!.."*

І камяні *"не возопили"*, і дах не абрынуўся ў тым Свята-Елісавецінскім манастыры, дзе адбываўся гэты дэманстратыўна-блюзнерскі тэатр аднаго акцёра. Дарэчы будзе сказаць, што пра тую *"обитель"* даўно ідзе пагаласка як пра надзейна схаваны за манастырскімі сценамі штаб *"русского мира"* пад самым Мінскам (манастыр знаходзіцца ў вядомых Навінках). Там выдаецца адпаведная літаратура, туды прыязджаюць з публічнымі лекцыямі розныя сумнеўныя дзеячы, якія прапаведуюць зусім не біблейскія каштоўнасці. Вось, напрыклад, цытата з выступлення нейкага Антона Маньшына, які быў прадстаўлены насельнікам манастыра як *"падпалкоўнік расійскага ГРУ"*: *"Скоро нашу святую Русь, без разделения на Белую, Малую и Великую, ждет война. Надеюсь, что присутствующие здесь мужчины примут в ней деятельное участие"*.

Калісьці пры савецкай уладзе існаваў ваяўнічы атэізм, а на прыкладзе Свята-Елісавецінскага манастыра мы бачым, як ідзе ў наступленне ваяўнічае праваслаўе. Дарэчы, падобным чынам наступала яно і на Данбасе, дзе прыходы і манастыры РПЦ часта рабіліся прытулкамі для змагароў за гэтак званую Данецкую народную рэспубліку.

Між іншым, сын протаіерэя Лемяшонка Дзмітрый, які часта бывае ў бацькавым манастыры, адкрыта носіць (сведчаць сацыяльныя сеткі) майкі з надпісам "ДНР", з выявай расійскага двухгаловага арла на грудзях. А яблык ад яблыні, як вядома, недалёка адкочваецца.

Заканчваючы гэты допіс, я даведаўся, што протаіерэй Лемяшонак забараніў бываць у сваіх уладаннях акцёру Аляксандру Ждановічу – вядомаму Маляванычу з тэлевізійнай "Калыханкі". Той кіраваў прыманастырскім дзіцячым тэатрыкам ды вось меў неасцярожнасць трапіць "на суткі" пасля аднаго з мірных шэсцяў. І святы айцец тут жа паказаў акцёру на парог.

Але, выганяючы Маляваныча (сумленнага чалавека і глыбокага верніка), манастырскі духоўнік, я перакананы, не меў права сказаць, як спрадвеку гаварылі ў народзе: вось Бог, а вось парог. Бо такую *"обитель"*, дзе адкрыта зневажаюцца хрысціянскія каштоўнасці, Бог даўно пакінуў. Напэўна, не мае Бога гэты царкоўны служка і ў сваёй галаве, апанаванай "русскомирской" ідэалогіяй.

Такая галава і такі манастыр, на маю думку, дыскрэдытуюць усю Беларускую праваслаўную царкву, якую ў бліжэйшай будучыні могуць пакінуць многія сумленныя вернікі. Мітрапаліту Веніяміну варта ўсё ж больш пільна прыглядзецца да таго, што адбываецца ў манастырах, якія знаходзяцца пад яго апекай.

ПАЗІЦЫЯ

Зварот каталіцкіх біскупаў Беларусі

Каталіцкія біскупы Беларусі звярнуліся да католікаў і ўсіх людзей добрай волі ў сувязі з паглыбленнем грамадска-палітычнага крызісу ў краіне

Наша бацькаўшчына Беларусь ужо чацвёрты месяц знаходзіцца ў нябачаным дагэтуль грамадска-палітычным крызісе, які, на жаль, паглыбляецца. Насілле не спыняецца, надалей праліваецца кроў, грамадства падзелена. Гэта не прадвяшчае нам шчаслівай будучыні, бо, як казаў Хрыстус, дом, падзелены сам у сабе, не выстаіць (пар. *Мц* 12, 25).

Цяжка паверыць, што такое адбываецца ў нашай міралюбнай краіне, вядомай сваёй талерантнасцю і згодай паміж людзьмі розных веравызнанняў і нацыянальнасцяў.

Каталіцкі Касцёл, кіруючыся Евангеллем і пабудаваным на ім сацыяльным вучэннем, выказваецца супраць насілля, беззаконня, несправядлівасці і няпраўды і асуджае іх. Касцёл заклікае да мірнага вырашэння ўзніклых праблем шляхам дыялогу ў духу любові да Бога і бліжняга, з захаваннем Божых і чалавечых законаў.

Мы, каталіцкія біскупы Беларусі, далучаемся да звароту Папы Францішка, скіраванага ім пасля малітвы «Анёл Панскі» 13 верасня 2020 года да дзяржаўных улад. У ім Пантыфік заклікаў прыслухацца да голасу суграмадзян і пайсці насустрач іх законным імкненням, забяспечваючы поўную павагу да правоў чалавека і грамадзянскай свабоды.

Пры гэтым мы хочам падкрэсліць, што галоўная мэта Касцёла – абвяшчаць Евангелле дзеля пабудовы Божага Валадарства, якое не кіруецца прынцыпамі гэтага свету і не прэтэндуе на зямную ўладу. Таму Касцёл не выконвае дзяржаўных функцый і не можа нікім выкарыстоўвацца ў палітычных мэтах.

У гэты лёсавызначальны час гісторыі нашай бацькаўшчыны, як навучаў святы апостал Павел, мы павінны несці цяжар адзін аднаго (пар. *Гал* 6, 2), аказваць узаемную падтрымку і салідарнасць дзеля будавання згуртаванай, а не падзеленай Беларусі.

Звяртаемся да католікаў і ўсіх людзей добрай волі з заклікам працягваць узносіць свае малітвы ў інтэнцыі хуткага і мірнага вырашэння крызісу, бо благаслаўлёныя міратворцы і тыя, хто імкнецца да справядлівасці, як кажа Хрыстус. Няхай дабро пераможа зло.

Мір і дабро табе, наша бацькаўшчына Беларусь!

Каталіцкія біскупы Беларусі.

Мінск, 25 лістапада 2020 года.

ЗАКЛІК

Заява Амбасады ЗША

Злучаныя Штаты асуджаюць дзеянні ўрада Беларусі ў дачыненні да мясцовых і замежных журналістаў. Прадстаўнікі СМІ не павінны падвяргацца пагрозам, фізічнаму гвалту, арыштам або турэмнаму зняволенню з боку каго-небудзь проста з прычыны выканання сваёй працы ў якасці журналістаў. Моцныя незалежныя СМІ, свабодны абмен інфармацыяй і доступ да яе неабходны для таго, каб вяршэнства закона магло ўкараніцца ў любым грамадстве.

Злучаныя Штаты вельмі занепакоены небяспечным становішчам беларускіх незалежных СМІ, адвольнымі арыштамі журналістаў за апошнія некалькі месяцаў і ўзбуджэннем урадам Беларусі крымінальных спраў супраць журналістаў. Мы па-ранейшаму занепакоены пагрозай анулявання афіцыйнага статусу мясцовых СМІ, а таксама спыненнем дзеяння акрэдытацый і працяглай затрымкай паўторнай акрэдытацыі журналістаў, якія працуюць на замежныя СМІ.

Мы настойліва заклікаем урад Беларусі абараняць і падтрымліваць асноўныя свабоды на ўсёй тэрыторыі краіны, асабліва свабоду сходаў, слова і прэсы. Беларускі народ заслугоўвае абароны сваіх правоў і таго, каб яго голас быў пачуты, а незалежныя СМІ – незаменная платформа для галасоў усіх беларусаў. Нармалізацыя адносін з рэжымам, які жорстка задушвае ўласны народ, немагчыма.

ЗА ПРАХАДНОЙ

Што там, на заводах?

Штрэйкбрэхеры на «Гродна-Азоце»

Паводле інфармацыі лідара страйкама гродзенскага прадпрыемства **Юрыя Рававолга**, усяго да страйку адкрыта далучыліся 34 "азотаўцы".

Каля 30 чалавек звольнілі, некаторых потым аднавілі на працы.

На завод прыехалі каля 30 штрэйкбрэхераў з Гомельскага хімічнага завода і "Нафтана".

Цяпер "азотаўцы" актыўна ўступаюць у незалежны прафсаюз, у якім ужо больш за 400 чалавек. За апошні месяц колькасць членаў вырасла ў некалькі разоў.

Сцяпан БУРАЧЭЎСКІ.

На МАЗе працягваюць разбірацца з «вальнадумцамі»

– На нашым прадпрыемстве сітуацыя падобна да той, што на Мінскім трактарным заводзе, – кажа кіраўнік "пярвічкі" прафсаюза РЭП Мінскага аўтамабільнага завода **Арцём Жэрнак**. – Кіраўнікі МАЗа і МТЗ дзейнічаюць у дачыненні да "вальнадумцаў" на заводах прыкладна аднолькава.

Страйкама на МАЗе сёння няма, але ў наш незалежны прафсаюз ужо ўступілі каля 100 чалавек. Відаць, паўплывала сітуацыя, калі людзям пачалі скасоўваць кантракты, а афіцыйны прафсаз маўчаў з гэтай нагоды.

Алесь ЗНАК.

Другі фронт салігорскіх страйкамаўцаў

Паводле дадзеных страйкама ААТ "Беларуськалій", да страйку ўжо далучыліся больш за 100 шахцёраў.

Стала вядома, што з-за рэпрэсій беларускіх улад у дачыненні да дэмакратычнай грамадскасці, у тым ліку да рабочых прадпрыемстваў, Канада, як і нарвежская кампанія Yara, гатова перагледзець адносіны з ААТ "Беларуськалій".

Не выключана, што Канада сумесна з краінамі Еўрасаюза распрацуюць увядзенне эмбарга на экспарт беларускіх калійных угнаенняў. З прычыны гэтага могуць быць замарожаны ўсе валютныя аперацыі кампаніі-трэйдара. Паводле некаторай інфармацыі, гэта пытанне будзе вырашацца ў бліжэйшыя тыдні.

Максім ЦЯРЭШЧАНКА.

На МТЗ страйкама няма

– Таму яднаемся вакол нашага незалежнага прафсаюза, у яго ўступаюць людзі, якія разумеюць, для чаго ён патрэбны, – *расказвае кіраўнік пярвічнай арганізацыі прафсаюза РЭП на трактарным заводзе **Міхаіл Громаў***. – Патрэбны ён для таго, каб адстойваць правы працоўных і зараз, і ў будучым. А страйкам – гэта, як я разумею, часовая структура, у якой ёсць нейкія задачы ў нейкі канкрэтны час.

На МТЗ толькі асобныя рабочыя заўлялі пра тое, што пачынаюць страйк, але адразу ж былі звольнены, бо абароны ад фіцыйнага прафсаюза практычна не было, а наш прафсаюз яшчэ зусім маленькі.

Трэба адзначыць, што пасля 9 жніўня многія рабочыя пачалі выходзіць з афіцыйнага прафсаюза, але і ў незалежны не спяшаліся ўступаць. У людзей наогул знік давер да любых прафсаюзаў за столькі гадоў падману. Толькі грошы выцягвалі, а рэальнай падмогі было зусім мала.

Зараз у нашай пярвічнай арганізацыі МТЗ больш за 100 чалавек, і праца працягваецца.

...Нягледзячы на ціск з боку ўлад

– Вельмі шмат прыйшло новых заяў на ўступленне ў незалежны прафаюз на Мінскім маторным заводзе, і валанцёры зараз будуць гэтым займацца, – *кажа прадстаўнік прафсаюза **Андрэй Комлік-Ямацін***. – Акрамя таго, на заводзе зараз тры чалавекі знаходзяцца ў страйку, у бліжэйшы час мы збяромся і абмяркуем сітуацыю.

Фактычна страйкам арганізаваў я, калі пачаў першы страйк, але хочам афіцыйна заявіць пра яго стварэнне. Пасля гэтага мяне звольнілі і адправілі на "суткі", а яшчэ два рабочыя, якія заявілі пра страйк, пакуль афіцыйна лічацца працуючымі на заводзе. На працу яны не ходзяць з 13 і 16 лістапада, але афіцыйна не звольнены.

Увогуле ж адразу пасля выбараў пад заявай аб забастоўцы падпісаліся каля 300 рабочых, але страйк у хуткім часе спыніўся, бо на працоўных пайшоў пэўны ціск.

Дарэчы, зараз у многіх людзей з'явілася апатыя ад той сітуацыі, што склалася ў краіне, некаторыя хочуць звальняцца. На заводзе не хапае кадраў, хаця, магчыма, гэта больш звязана з пандэміяй. Ведаю, што ІТР-аўцаў пераводзяць на рабочыя пасады, інжынераў ставяць працаваць аператарамі.

Між тым я зараз буду судзіцца з прадпрыемствам. Праз суд патрабую аднаўлення на працы і матэрыяльнай кампенсацыі.

Міхась ПАДОЛЬСКІ.

АЛЬТЭРНАТЫВА

Ігар КОМЛІК: «Прафсаюз РЭП пашыраецца…»

– Первічныя арганізацыі незалежнага прафсаюза з'явіліся на Мінскім аўтамабільным, трактарным, маторным заводах, у ААТ "Пеленг" і Навукова-даследчай арганізацыі "Гіпрасувязь", – *паведаміў "Народнай Волі" **Ігар Комлік***. – Таму, як кажуць, у шапку не спім.

У нас рабочыя, на жаль, прызвычаіліся атрымліваць міласціну ад прафкама і наймальніка, многія нават не ўяўляюць, што нейкім чынам можна абмяркоўваць пытанні аплаты працы. Яны думаюць, што ўсё дасць добры начальнік і для гэтага не трэба прыкладаць ніякіх высілкаў. А задача ўлад якраз і заключаецца ў тым, каб з рабочых зрабіць паслухмяных, безыніцыятыўных, маўклівых людзей.

Зараз многія таму і маўчаць, што баяцца аказацца звольненымі. Даводзіцца праводзіць пэўную працу на прадпрыемствах, каб людзі зразумелі: у іх ёсць правы, а ў наймальніка ёсць абавязкі.

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

ПАЗІЦЫЯ

Аляксандр ЯРАШУК: «Ім жа цэлых 26 гадоў убівалі ў галовы, што яны – рабы без правоў…»

Аляксандр Ярашук, старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў, сказаў "Народнай Волі", што сёння не варта кідаць камяні ў беларускіх працоўных за тое, што яны пакуль не падняліся на ўсеагульную забастоўку і не падтрымалі тых таварышаў, якія ўступілі ў страйк.

– Гэта той выпадак, калі не трэба ні асуджаць, ні супрацьпастаўляць адных рабочых другім, – *падкрэслівае прафсаюзны актывіст*. – Наадварот трэба знаходзіць словы падтрымкі і веры ва ўсіх нашых працоўных.

Можна сказаць, што толькі 100 чалавек з 15 тысяч работнікаў ААТ "Беларуськалій" далучыліся да страйку, а можна выказацца па-іншаму: "Ужо сто шахцёраў увайшлі ў страйкам, і працэс гэты не спыняецца". Гэта азначае, што іх падтрымлівае вялікая колькасць іншых рабочых.

Да гэтага ім цэлых 26 гадоў убівалі ў галовы, што яны – рабы без правоў, і многім вельмі няпроста пазбавіцца рабскага мыслення, стаць свабоднымі людзьмі. Але працэс гэты ідзе. Можа, працякае ён не так хутка, як хацелася б, але яго дакладна немагчыма паскорыць абвінавачаннямі і прэтэнзіямі.

Віктар ШПАК.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

Ингрида Шимоните – новый премьер Литвы

Інгрида Шимоните родилась 15 ноября 1974 года в Вильнюсе. Окончила экономический факультет Вильнюсского университета, бакалавр в области бизнес-администрирования. Степень MBA получила в Стокгольмской школе экономики.

Работала в налоговом отделе Министерства финансов Литвы в 1997–2001 году. В 2004–2009 годах – секретарь Министерства финансов. В 2013 году была назначена заместителем председателя правления Банка Литвы. Параллельно с выполнением должностных обязанностей преподавала экономику в Институте международных отношений и политических наук, а также государственные финансы – в Университете менеджмента и экономики ISM. Ушла в отставку 31 октября 2016 года в связи с избранием депутатом Сейма по Антакальнисскому избирательному округу в Вильнюсе.

4 ноября 2018 года победила на праймериз по определению кандидата на выборах президента Литвы в 2019 году от Союза Отечества – Литовских христианских демократов, опередив своего конкурента – дипломата Вигаудаса Ушацкаса с результатом в 78,71 процента.

Не замужем, детей нет. Свободно владеет кроме литовского английским, русским и польским языками.

ПРОГНОЗ

В 2021 году Беларусь ожидает стагнация экономики

Евразийский банк развития ожидает, что темп восстановления белорусской экономики в 2021 году будет медленным не только в связи с пандемией, но и в связи с напряженной общественно-политической ситуацией внутри страны.

Что касается итогов нынешнего года, то прогноз таков: сокращение валового внутреннего продукта произойдет на 1,5 процента. Это является результатом низкой инвестиционной активности, а также потери динамики в развитии IT-сектора.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Мікола Купава на рэабілітацыі

Адзінаццаты дзень змагаецца з кавідам адзін з найстарэйшых беларускіх мастакоў **Мікола КУПАВА**. Мы датэлефанаваліся да Мікалая Мікалаевіча і даведаліся, што тэмпература, дзякуй Богу, спала, адчувае ён сябе значна лепш, зараз знаходзіцца на рэабілітацыі ў Аксакаўшчыне. А пачынаў лячэнне ў 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска. Дарэчы, ляжаў у траўматалагічным аддзяленні – зараз кавідныя хворыя ляжаць ва ўсіх аддзяленнях, дзе ёсць вольныя палаты.

– Лячылі добра і шмат, – распавёў мастак. – І таблеткамі, і ўколамі, і на апараце ШВЛ паляжаў. Здаецца, выкараскаўся. Цяпер прыехаў нарэшце на рэабілітацыю ў рэспубліканскі цэнтр у Аксакаўшчыне. У палаце два чалавекі. Заўважу: усё медыцынскае абслугоўванне бясплатнае.

Мікола Купава – лаўрэат дыплома і медаля Францыска Скарыны. Ён стваральнік цэлай галерэі партрэтаў дзеячаў беларускай культуры: Цёткі, Багушэвіча, Дуніна-Марцінкевіча, Каліноўскага, Купалы, Коласа, Караткевіча. Яго творы вызначаюцца самабытнасцю, асаблівай вытанчанасцю і высакароднасцю. Адзін з іх майстар падарыў нашай газеце, ён вісіць на ганаровым месцы ў кабінеце галоўнага рэдактара.

У 1991 годзе мастак удзельнічаў у распрацоўцы эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь «Пагоня».

Мы жадаем спадару Міколу здароўя і добрага настрою! Нягледзячы ні на што.

Вікторыя ДРОЗД.

ЦИФРЫ

Плюс 1563…

В Беларуси зафиксированы 130.012 случаев COVID-19 с начала пандемии, сообщает Министерство здравоохранения. Прирост за сутки – 1563, днем ранее было 1496 случаев.

Выздоровели и выписаны 108.769 пациентов (1317 за последние сутки), у которых ранее был подтвержден диагноз COVID-19. За весь период распространения инфекции на территории страны умерли 1128 пациентов (девять за последние сутки).

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27 ЛІСТАПАДА 2020 г.

МЕРКАВАННЕ

Зянон ПАЗЬНЯК: Кожны адкажа паводле закона

*Лідар КХП–БНФ **Зянон Пазьняк** напісаў тэкст «Аб карніках». У ім ён разважае аб адказнасці сілавікоў, якія жорстка збівалі і катавалі беларусаў.*

Пазьняк упэўнены, што АМАП прызнаюць тэрарыстычнай арганізацыяй.

«Прыналежнасць да АМАПа цягне калектыўную адказнасць. Будуць арыштаваны ўсе ўдзельнікі гэтага фарміравання. Але падыход суда будзе на ўзроўні закона, індывідуальны. Прысуд атрымаюць за злачынствы, якія будуць даказаны», – піша Зянон Пазьняк.

Таксама Пазьняк узгадвае ў тэксце 30 байцоў ваеннага спецназу, якія, паводле паведамленняў у СМІ, удзельнічалі ў разгонах мірных пратэстаў у Мінску. Ён лічыць, што і яны пойдуць пад суд.

РЭПЛІКА

Ахвочых захаваць Беларусь без перамен сабралася ў Доме афіцэраў вельмі мала

У мінулую суботу ў сталічным Доме афіцэраў прыхільнікі Лукашэнкі арганізавалі канцэрт "Захаваем мірную Беларусь". Уваход быў бясплатны. Але, нягледзячы на такі бонус, ахвочых захаваць Беларусь у тым выглядзе, які надаў ёй аўтарытарны рэжым, знайшлося вельмі і вельмі мала. Канцэрт прайшоў амаль пры пустой зале: у партэры яшчэ некалькі радоў былі заняты гледачамі, а за імі – толькі зрэдку некалькі чалавек.

Рэгіна ГУЛЯЕВА.

СМЕХОТУРА

Понятой в наручниках

19 ноября в доме врача-анестезиолога Артема Сорокина, давшего информацию о том, что в крови убитого Романа Бондаренко не содержалось алкоголя, состоялся обыск. Оказывается, тот факт, что алкоголя в крови убитого не было, подрывает общественную безопасность. Причем настолько, что арестовывают врача и написавшую об этом журналистку. Так что на свободе остается разве что мать убитого, которая эту информацию также предала гласности. Но ее отправлять за решетку было бы уж совсем неприлично: женщина потеряла сына, а тут бы еще и свободу отняли.

Однако речь сейчас не об этом. Речь об обыске.

Жена задержанного врача рассказала:

– Из всех, кто пришел на обыск, я знала только нашего участкового, к нему наручниками был пристегнут мужчина с синяком под глазом – это один из понятых. Вторым понятым была незнакомая женщина. Еще был прокурор и мужчина, которого я сегодня видела в КГБ, – он меня узнал и даже поздоровался.

Ну, в КГБ у нас служат исключительно вежливые люди – судя по тому, что рассказывала мне об обысках 2010 года моя жена, прошедшая через весь этот кошмар. Примечательно другое – понятой.

Понятых, оказывается, у нас теперь принято пристегивать к участковому наручниками. Вероятно, чтобы не уклонились от исполнения своего «гражданского долга». В сложившейся ситуации многие люди не хотят иметь никаких отношений с правоохранительными органами. Вот и нашел выход из положения местный Анискин – в качестве понятого он взял человека, явно совершившего преступление, иначе он не был бы в наручниках.

Смешно и печально! В 2010 году к таким мерам не прибегали. Тогда во время первых обысков, еще в мае, в качестве понятых милиция привезла двух милых девушек, проявлявших особый интерес к тумбочкам с нижним бельем хозяйки. От хозяина же – в данном случае, от меня – милиция упорно требовала выдать незаконно нажитые деньги, оружие и наркотики. Оружия и наркотиков у нас отродясь не было, а на вопрос, как распознать на глаз незаконно и законно нажитые деньги, милиционер уныло пожал плечами. Вероятно, они отличались бы размером – но в нашем случае и размер явно не впечатлял.

Откуда же в данном случае взялся понятой с подбитым глазом и в наручниках? Продолжу свое высказывание о предположении – и да не станет оно поводом для подозрений в умышленном подрыве общественной безопасности. Милиция не рискует объявлять простым гражданам – например, соседям – о своем желании привлечь их выступить в качестве понятых. На гражданине ведь не написано, каких именно взглядов он придерживается, за кого подпись поставил, а то и вовсе – проголосовал. Может ведь и ответить, говоря словами великого украинского поэта, «незлым тихим словом». Или – злым и громким. А какому участковому хочется услышать подобные слова в свой адрес?

Но, с другой стороны, служебные обязанности исполнять надо. Тем более – если не сам участковый обыск этот инициировал, а позвонили ему со стороны и сказали:

– Давай, братец, быстро собирайся и дуй по данному адресу, захватив понятого.

Вот он и «захватывает» уже вполне «захваченного» понятого, транспортировать которого – куда бы то ни было – он должен исключительно в прикованном к самому себе состоянии. Какие «сутки» и за что именно мог отбывать «захваченный» понятой – в данном случае мы не знаем. Остается лишь надеяться, что речь идет не о серийном убийце, который мог воспользоваться случаем, чтобы вырваться на свободу, отгрызши руку несчастному участковому. Если же приковали его наручниками исключительно за мелкое хулиганство, то мы вздохнем с облегчением, понимая: ни участковому, ни прокурору с подозрительно вежливым человеком из коридоров КГБ ничего не грозило. И до приговора все заинтересованные лица благополучно доживут.

В любом случае, судя по похвальным характеристикам, которые бывший начальник ГУБОПиК, а ныне заместитель министра внутренних дел полковник Карпенков давал бандитам, вдруг решительно начавшим проявлять политическую сознательность и представляющим сегодня, по мнению г-на Карпенкова, меньшую угрозу для общества, нежели «политические», наше государство стоит на вполне понятном пути. Сначала правонарушителями – из «неполитической» тусовки – дают статус понятых, а затем таких же – только рангом повыше и со статьей покруче, чтоб не сявками какими-нибудь были – привлекают в качестве следователей, прокуроров и судей. Чтобы с «чуждыми элементами» разбирались совсем уже «по понятиям».

Поверьте, они охотно и со знанием дела справятся с подобными обязанностями! Да и Карпенкову с ними привычней будет работать. Во всяком случае, мне так кажется.

Александр ФЕДУТА.

ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Пацярпеў ад гвалту і стаў падазраваным

*Гісторыя 54-гадовага слесара нафтаперапрацоўчага завода з Мазыра **Юрася Чаранкова** і яго жонкі **Алены**, настаўніцы матэматыкі СШ №6, як нельга лепей ілюструе цяперашнюю сітуацыю з існуючымі парадкамі і законнасцю ў краіне. Дакладней, з бязмежным здзекам з гэтай самай законнасці і парадку, не кажучы ўжо пра здаровы сэнс.*

А здарылася вось што. 11 жніўня міліцыянеры схапілі Юрася з жонкай на бульвары Юнацтва непадалёку ад дома, калі яны пасля працы выйшлі на шпацыр. Гэта зусім не цэнтр. І час быў не позні – каля 9 вечара. Яшчэ нават сонца не паспела як след схавацца за небасхіл.

«Наляцелі, нібы тыя звяры. Выглядала, што ў іх было нейкае заданне хапаць грамадзян і зрываць злосць на іх за прайгрышы на выбарах галоўнакамандуючага», – расказвае пасля таго жудасная жніўеньская аўторка Чаранкоў.

Атака на «Пагоню»

У Юрася былі гематомы ад пабояў на грудзях, жываце, ягадзіцы, нагах. Адну нагу надзвычай моцна выцялі дручком, яна апухла каля ступні і амаль не згіналася. Слесар не мог нармальна хадзіць і ажно дзесяць дзён знаходзіўся на бальнічным. У тлумачальнай запісцы на патрабаванне адміністрацыі завода ён так і напісаў: *«Падчас прагулкі быў жорстка затрыманы міліцыяй і па-зверску збіты. Да траўматолага звярнуўся 16.08.20 пасля вызвалення».*

Тым не менш на падставе міліцэйскіх рапартаў і пратаколаў Чаранкову і яго жонцы Алене суддзя **Марына Буглак** прысудзіла па 15 сутак арышту. Абвінавачванне стандартнае: удзельнічалі ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, выкрыквалі лозунгі «Сыходзь!», «Жыве Беларусь!».

Чаранкоў схільны быў лічыць, што затрымалі яго, а заадно і жонку таму, што на ім была майка з выявай «Пагоні» на грудзях, а на спіне – з надпісам «Жыве Беларусь!». Гістарычныя беларускія сімвалы сталі чамусьці для цяперашняга рэжыму не адлюстраваннем патрыятызму і нацыянальнай годнасці, а гэткім раздражняльнікам, які трэба душыць, таптаць, знішчаць. Суды ж асабліва не ўнікалі ў складзеныя міліцыяй адміністрацыйныя пратаколы – працавалі цэлы канвеер дзеля ізаляцыі не згодных з вынікамі выбараў.

3 бульвара – у калонію

У суд Чаранкова нават не вазілі – асудзілі ў міліцыі на другія суткі пасля затрымання. Месцаў у ізалятары Мазырскага РАУСа ўжо не хапала, і многіх, у тым ліку і Юрася, адвезлі ў калонію №20, дзе ён правёў яшчэ двое сутак.

Вызвалілі слесара Чаранкова ды іншых «сядзельцаў» на чацвёрты дзень – таго патрабавалі калегі па працы і кіраўніцтва НПЗ, якія звярнуліся ў райаддзел міліцыі.

На волі Юрась Чаранкоў не толькі зняў пабоі, але і падаў заяву ў раённы аддзел Следчага камітэта, каб выявілі вінаватых у гвалце і прыцягнулі да адказнасці. Тое ж самае зрабіла і яго жонка Алена. Указалі Чаранковы нават прозвішчы нападнікаў, бо ведалі іх – гэта ўчастковыя **Ігар Пілановіч** і **Андрэй Аскерка**. Дачку апошняга Алена Чаранкова нават вучыла ў школе.

«Дадатковыя праверачныя дзеянні»

Праверка па заяве мужа і жонкі Чаранковых наконт супрацьпраўных дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі зацягнулася. 26 жніўня старшы следчы маёр юстыцыі **Блінец** падоўжыў яе на месяц і перадаў матэрыялы праверкі ва ўпраўленне СК па Гомельскай вобласці, а там ужо новы следчы **Высоцкі** працягнуў правядзенне праверкі яшчэ на два месяцы – да 15 лістапада, як пазначана ў лісце №15387 на адрас Чаранковых, *«у сувязі з неабходнасцю правядзення дадатковых праверачных дзеянняў».*

Правяраць як быццам правяралі, але ўжо 6 лістапада следчы па аддзелах унутраных спраў **Фядотаў** напісаў Юрасю і Алене Чаранковым, што следства паводле іх заявы пра нанясенне цялесных пашкоджанняў супрацоўнікамі РАУС *«прыпынена да атрымання вынікаў экспертызы».*

Падазраваны ў абразе

Тым часам у самім Мазыры на пачатку лістапада следчы райаддзела СК падпалкоўнік юстыцыі **Канануччанка** прызнаў Юрася Чаранкова *«падазраваным у здзяйсненні злачынства, прадугледжанага артыкулам 369 Крымінальнага кадэкса».* Гэта публічная абраза прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Артыкул прадугледжвае нават арышт да трох гадоў.

Канануччанка ўстанавіў, што ў тэлеграм-канале «Мазыр 97%» невядомыя змясцілі каментарыі, якія ўтрымліваюць *«абразлівыя і паклёпніцкія звесткі ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў як прадстаўнікоў улады ў адносінах да супрацоўнікаў АУС Мазырскага райвыканкама участковых інспектараў міліцыі Ігара Пілановіча і Андрэя Аскеркі».*

Паводле меркавання следчага, адзін з каментарыяў з прыкметамі абразы належыць менавіта Юрасю Чаранкову. З гэтай прычыны ён і падазраваны, а жонка – сведка.

Каментарыі Чаранкова сапраўды былі ў адкрытым доступе – словы ў ім літаратурныя, тры з якіх, магчыма, і крыўдныя ці нават абразлівыя. Так слесар адрэагаваў на сваё і жончына збіццё ўчастковымі міліцыянерамі, калі тыя 11 жніўня «выконвалі службовыя абавязкі як прадстаўнікі ўлады».

Эміграцыя

Чаранковы не сталі чакаць развязкі крымінальнай справы і на днях пакінулі межы Беларусі. Юрась запісаў нават відэазварот да калег з НПЗ, у якім зазначыў: яго з жонкай віна толькі ў тым, што яны *«адкрыта і паўсюды расказвалі, што з імі адбылося».* І дадаў: *«Шаноўныя мае калегі, трымайцеся, думайце што рабіць далей. Маўчаннем мы нічога не зменім у гэтай краіне».*

Сказаў гэта з сумам і спадзевам на хуткае вяртанне.

Анатоль ЛІПСКІ.

РАЗОБЛАЧЕНИЕ

Врач в пух и прах разнес аргументы Генпрокуратуры

Телеграм-канал «Белые Халаты» опубликовал пост, в котором врач в пух и прах разносит аргументы Генеральной прокуратуры.

«Мы видим, как представители силовых структур вместо того, чтобы расследовать дело о смерти Романа Бондаренко, продолжают искать в организме погибшего молодого парня мифический этанол, – пишет телеграм-канал. – В некотором роде им это «удалось»: подхватывающие крохи информации с барского стола силовиков госСМИ во главе с товарищем Азарёнком объявили, что следы метаболитов алкоголя были обнаружены в чудом сохранившейся (после суток в реанимации на инфузии и диуретиках) моче Романа Бондаренко.

Мы получили комментарий психиатра-нарколога на этот счет. Доктор пожелал остаться инкогнито, однако дал исчерпывающие пояснения относительно ситуации с этанолом в моче:

«В ближайшее время после того, как в организм человека поступает алкоголь, на экспертизе по выявлению этанола и его метаболитов в естественных жидкостях организма мы видим повышенную концентрацию этанола в крови и нулевую – в моче.

Далее, по мере элиминации (выведения) алкоголя из организма, концентрация этанола в крови снижается, а в моче – растет. В отдаленные сроки после приема человеком алкоголя следы этанола и его метаболитов могут оставаться только в моче (причем довольно долго, что зависит от многих факторов).

Результат «0 промилле этанола» в крови и следовое содержание в моче называется «подтвержденный факт употребления алкоголя в прошлом», что, строго говоря, абсолютно не является алкогольным опьянением в текущий момент.

Также стоит заметить, что диагностика алкогольного опьянения, согласно приказу МЗ РБ от 13.07.2011 №732 «Об утверждении клинических протоколов по диагностике алкогольного и иного опьянения в организациях здравоохранения», проводится на основании анализа КРОВИ на этанол».

Телеграм-канал «Белые халаты» напоминает: головной мозг человека снабжается кровью, а не мочой. Нет алкоголя в крови – нет и эффекта этанола на поведение и трезвость сознания.

И все же прокуратура раз за разом пытается указывать на детали, причем неумело состряпанные, чтобы изменить повестку и отвести внимание людей от старательно игнорируемого силовыми службами, но неопровержимого факта убийства Романа Бондаренко. Вероятно, представители прокуратуры и госСМИ забыли о том, что алкогольное опьянение является отягчающим обстоятельством для того, кто совершил преступление, а не для жертвы последнего. Особенно если в крови жертвы уровень этанола был 0 промилле.

Однако раз представители прокуратуры так жаждут хоть у кого-то найти в биологических жидкостях этанол, можем порекомендовать им взять анализ крови у любителей «Массандры».

Сколько бы товарищ Азарёнок с хором государственных СМИ на подпевке ни тиражировали мысль о наличии этанола в организме погибшего Романа, факт того, что нельзя оправдать убийство человека его выдуманным алкогольным опьянением, остается неоспоримым, заключает телеграм-канал.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

На выстаўцы ў Кітаі – новая мадэль трактара Belarus-3523

Здзівіць кітайцаў новай сельскагаспадарчай тэхнікай не так проста. І ўсё ж беларускія трактаравытворцы спрабуюць гэта зрабіць. На адной з найбольш маштабных выставак у Паднябеснай яны прэзентавалі новую мадэль трактара Belarus-3523. Яе характарызуе электрамеханічная трансмісія CRRC і дызельны рухавік CUMMINS.

Што ж, хочацца спадзявацца, што кітайскія аграрнікі зацікавяцца навінкай беларускіх трактаразаводцаў.

Вераніка МАКСІМОВІЧ.

22 ноября 1996 года представителями депутатов А.О.Добровольским, В.А.Щукиным, М.К.Грушевским были заявлены ходатайства о приостановлении производства по делу об импичменте либо об отложении его слушания в связи с «Соглашением от 22 ноября 1996 года об общественно-политической ситуации и о конституционной реформе в Республике Беларусь». Это, на мой взгляд, было ошибкой.

(Продолжение следует.)

ЧУЛІ?

Дэпутат Мінгарсавета ўнёс у парадак дня сесіі пытанні пра гвалт і рэпрэсіі

*Дэпутат **Павел Бачарнікаў** накіраваў зварот на імя старшыні Мінскага гарадскога Савета **Андрэя Бугрова** з просьбай уключыць у парадак дня наступнай сесіі пытанні, звязаныя з акцыямі пратэсту, якія праходзяць пасля сфальшаваных выбараў.*

Дэпутат просіць разгледзець пытанні вызвалення палітвязняў, расследавання гвалту, а таксама магчымасці збірацца на масавыя мерапрыемствы па заяўным прынцыпе.

Бізнесмен Павел Бачарнікаў з'яўляецца дэпутатам ад Слабадской акругі ў Малінаўцы. Пасля выбараў ён выступіў супраць гвалту ў дачыненні да ўдзельнікаў акцый пратэсту, а таксама аб'яднаў намаганні з дэпутаткай Мінскага гарсавета **Вольгай Цесаковай**.

У звароце Бачарнікаў піша: «*З 9 жніўня наш горад стаў арэнай грубых парушэнняў правоў грамадзян, жорсткага падаўлення мірных акцый пратэсту. Органы ўлады і кіравання самаўхіліліся ад выканання сваёй асноўнай функцыі прадстаўлення і абароны інтарэсаў народа. Улада для захавання інтарэсаў меншасці спрабуе маніпуляваць грамадскай свядомасцю, груба падмяняючы паняцці і фальсіфікуючы факты.*

Прамаруджванне абраннікаў народа ў выразным выказванні і вызначэнні грамадзянскай пазіцыі, заснаванай на запыце выбаршчыкаў, вядзе як да дыскрэдытацыі дэпутатаў, так і ўсяго канстытуцыйнага інстытута народаўладдзя».

«*Ад імя і па даручэнні жыхароў Мінска*» дэпутат Бачарнікаў просіць вынесці на разгляд бліжэйшай сесіі Мінгарсавета наступнае:

– запатрабаваць і прыняць комплекс мер і дзеянняў па вызваленні ўсіх зняволеных і затрыманых на падставах, звязаных з пратэстнымі акцыямі і выказваннем грамадзянскай пазіцыі;

– даць прынцыповую ацэнку нічым не справакаванаму і неабгрунтаванаму гвалту, які адбываецца ў Мінску з 9 жніўня, прымяненню спецсродкаў, спецыяльнай і баявой тэхнікі, дамагчыся спынення антыгуманных дзеянняў;

– стварыць камісію па выяўленні прычын і падстаў узнікнення пратэстных акцый з ліпеня 2020 года і іх сілавога падаўлення;

– даць ацэнку дзеянням органаў следства пры разглядзе зваротаў грамадзян па фактах забойстваў, замаху на забойства, збіцця падчас затрыманняў, пры суправаджэнні і знаходжанні ў РУУС і ЦІП;

– дамагчыся поўнага і аб'ектыўнага расследавання гэтых спраў, няўхільнага, бесперашкоднага забеспячэння прававой дапамогі грамадзянам па дадзенай катэгорыі спраў;

– даць жыхарам Мінска магчымасць праводзіць масавыя мерапрыемствы ў родным горадзе па заяўным прынцыпе.

КАТАВАННІ

«У фашыстаў былі газавыя камеры, у нас – кавідныя»

Людзі, якія вяртаюцца пасля адседкі, масава хварэюць на каранавірус. Адміністрацыя турмаў не робіць ніякіх захадаў засцярогі – у Баранавічах у перадачах для зняволеных не прымаюць нават маскі.

У Баранавічах у перадачах не прымаюць маскі

Журналіст **Арцём Лява** вызваліўся ў панядзелак з Баранавіцкага ізалятара часовага ўтрымання пасля 15 дзён арышту. Адчувае сябе дрэнна.

За 15 дзён ён прайшоў тры ізалятары: жодзінскі, акрэсцінскі і баранавіцкі. Кажа: перавозілі арыштантаў у аўтазаках, як «селядцоў у бочцы».

«З Жодзіна на Акрэсціна везлі ў аўтазаку з адсекамі. Я быў у бакавой клетцы на двух чалавек, а нас па трое запіхвалі. Духата, замкнутая прастора, няма чым дыхаць. У Жодзіне ў камеры ўдвая больш людзей, чым нар. У Баранавічах у камеры-размеркавальніку на 10 чалавек нас было чалавек сто.

Умовы ў Баранавічах жудасныя – стары будынак савецкіх часоў, зваранья з крывых вугалкоў і пласцін жалезныя нары, вільгаць. Вады гарачай не было, падлога бетонная. У душ адвялі адзін раз за 15 дзён. Паўпадвальнае памяшканне, акно на ўзроўні зямлі.

Якая была маска на чалавеку, калі яго забралі, у той і хадзіў. У Мінску, дарэчы, маскі ў перадачах дазвалялі. А ў Баранавічах мама спрабавала перадаць маскі – не прынялі», – расказвае Арцём.

«Турэмных дактароў трэба караць за халатнасць»

Праз пару дзён адзін з дзевяцёх сакамернікаў Арцёма захварэў, пачаў моцна кашляць, у яго рэзка знік нюх. Хлопцы даводзілі доктару, што прастуджаны ўсе, але ў гэтага чалавека канкрэтныя сімптомы COVID-19. Аднак доктар не прарэагаваў на скаргі.

«Доктар змераў тэмпературу, сказаў, што тут усе кашляюць. Удзень забаранялася ляжаць – матрацы згортваюцца, закідваюцца наверх – і сядзі на жалезных нарах, нават калі дрэнна сябе адчуваеш. Святло гарыць усю ноч – уявіце, як цяжка хвораму чалавеку.

На маю думку, турэмных дактароў трэба караць за халатнасць – яны проста ставяць пад пагрозу жыццё і здароўе вялікай колькасці арыштаваных. Ніякіх захадаў з нагоды пандэміі не рабілі наогул.

Наш доктар быў настолькі абыякавы і чэрствы! Прасілі ў яго дазволіць кіпеню болей, бо людзі сапраўды дрэнна сябе адчувалі, – ён не дазволіў. Крымінальнікам, дарэчы, дазвалялі кіпяцільнікі, нам – не», – абураецца Арцём.

Самымі чалавечнымі аказаліся «баландзёры» – людзі, якія разносілі ежу. Прычым яны крымінальнікі, усе ў татуіроўках. Калі «палітычныя» прасілі іх даліць больш гарбаты, бо людзі хварэюць, яны заўсёды давалі больш, успамінае Арцём.

Арцём Лява (у цэнтры) пасля вызвалення, Баранавічы, 23 лістапада.

Сам ён хварэе ўжо чатыры дні. Спачатку былі кашаль, слабасць. У апошні дзень у ізалятары страціў нюх.

«Мыла дзягцярнае страшна смярдзіць, а я не адчуваю паху. Учора раніцай знарок нюхаў шампунь дзягцярны, а ў яго пах наогул жудасны – таксама «па нулях». Паху дэзынфектару не адчуваю.

Цяпер разумею, што гэта сур'ёзная хвароба. Нібыта і дома ўжо начаваў, але пакутаваў, амаль не спаў. Баліць горла, цяжка дыхаць, кашаль забівае», – расказвае Арцём Лява.

Ён ужо запісаўся на тэст і на прыём да доктара ў сваёй паліклініцы. Калі расказаў, адкуль вярнуўся, там паставіліся з разуменнем. Адзіная была ўмова, каб сам прыйшоў на прыём, а не доктар да яго дадому.

Захварэлі ўсе музыканты гурта «Рэха», адзін у шпіталі

Музыканты гурта «Рэха», якіх затрымалі 7 лістапада ў поўным складзе пасля выступлення на вуліцы Нёманскай у Мінску, таксама дрэнна пачуваюцца, расказаў лідар гурта **Андрусь Такінданг**.

«Спачатку ўсе чацвёра музыкантаў апынуліся ў адной камеры на Акрэсціна. Потым Кастуся Лісецкага і Лёню Паўлёнка адправілі ў Жодзіна, я ўсе 15 сутак адседзеў на Акрэсціна. Лёня захварэў, Кастусь наогул трапіў у шпіталь. Я таксама блага сябе адчуваю, збіраюся здаць тэст на каранавірус», – расказаў Андрусь Такінданг.

Кастусь Лісецкі ўжо 10 дзён ляжыць у Магілёўскім абласным шпіталі з COVID-19 і двухбаковай пнеўманіяй. Падазрае, што падхапіў вірус у Жодзіне.

«У камеры было 10 чалавек, і ў многіх былі ўсе прыкметы кавіду: кашаль, адсутнасць нюху, – а медыцынскай дапамогі наогул не было, у найлепшым выпадку маглі даць таблеткі, якія перадавалі ў перадачах. Больш нічога», – кажа Кастусь пра жодзінскую турму.

Пасля шпіталя давядзецца даседжваць тэрмін

З Жодзіна Кастуся Лісецкага перавялі ў Магілёў. А там яму трапіліся адказныя ўрачы. Калі адчуў, што ў яго гарачка, паклікаў фельчара, той змераў тэмпературу і адразу ж выклікаў хуткую дапамогу.

«Праз гадзіну прыехала хуткая, тэмпература была 38,5. Паслухалі і адразу сказалі, што ў мяне дакладна пнеўманія. Забралі ў абласны шпіталь, цяпер забіты пад завязку. 10 дзён таму ў маім аддзяленні было 37 чалавек, цяпер – 70.

Адразу прызначылі антыбіётыкі, гармапальны прэпарат. Зрабілі спачатку экспрэс-тэст, потым ПЦР – пацвердзіўся каранавірус. Камп'ютарную тамаграфію не рабілі, толькі здымак – яшчэ і пнеўманія.

Цяпер адчуваю сябе больш-менш нармальна. Але ў турме было вельмі дрэнна, я быў нібы тая гародніна. Калі б не выклікалі хуткую, не ведаю, што было б. У фашыстаў былі газавыя камеры, у нас – кавідныя», – уздыхае Кастусь Лісецкі.

Ён кажа, што вельмі дапамагаюць валанцёры, а таксама мясцовая суполка ГА ТБМ: прыносяць перадачы, кнігі.

Да панядзелка музыканта дакладна будуць трымаць у шпіталі. А потым, хутчэй за ўсё, яму давядзецца даседжваць другую частку тэрміну – яшчэ 7 дзён.

(Svaboda.org)

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

«Поздравляю с повышением: вы были решалами, а теперь мокрушники»

Известный ресторатор снял видео о Шакуте и Баскове.

Ресторатор **Вадим Прокопьев** опубликовал очередное видео на своем ютуб-канале. В нем он обращается к главе Федерации хоккея Беларуси **Дмитрию Баскову** и многократному чемпиону мира по муайтай **Дмитрию Шакуте**. Их связывают с избиением вечером 11 ноября 31-летнего жителя «Площади Перемен» Романа Бондаренко, который скончался в минской больнице скорой помощи 12 ноября.

Ролик длится чуть более пяти минут. Прокопьев рассказывает, как Шакута и Басков выслуживаются перед Лукашенко. Первый, например, еще в середине июля записал короткое видео, в котором вызвал на бой Прокопьева, вызвавшего в свою очередь на бой Лукашенко. Второй же действует иными способами. *«Дима Басков другой,* – считает ресторатор. – *Он позер, нарцисс, ухаживает за стрижечкой, загорает в солярии»*. По мнению Прокопьева, Басков пробился в ближайшее окружение Лукашенко через тренерство его младшего сына Николая.

Ресторатор убежден, что шаткое положение Лукашенко привело к новому статусу присягнувших на верность власти Шакуты и Баскова. *«Поздравляю с повышением: вы были решалами, а теперь мокрушники»*, – говорит Прокопьев. Он называет Дмитриев соучастниками преступлений и пророчит им суд.

Посмотреть ролик – в нем, кроме прочего, звучат и новые подробности убийства Романа Бондаренко – можно на ютуб-канале Вадима Прокопьева.

ПАМЯЦЬ

Ён бачыў Беларусь незалежнай і неўміручай

26 лістапада споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

Ул.Караткевіч з жонкай Валянцінай.

Ул.Караткевіч з Л.Геніюш, Н.Мацяш, Д.Бічэль і В.Коўтун.

Як Баба-Яга стала… паўстанцам Машэкам

Перачытваючы нядаўна Івана Буніна, яго знакамітыя "Акаянныя дні", я па інерцыі пагартаў увесь ягоны шасцітомнік і спатыкнуўся вокам на вершы "Баба-Яга". Ён падаўся мне знаёмым, хоць, прызнацца, Буніна-паэта я амаль не чытаў, паланёны яго чароўнай прозай. Так бывае – каб самахоць не дамяшаць лыжку расчаравання ў бочку любові да пэўнага пісьменніка, пачынаеш неяк інстынктыўна абмінаць тыя жанры, дзе твой улюбёнец не дасягнуў належнай вышыні. Так у мяне сталася з Буніным, чыя паэзія мае чытацкія рэцэптары пакідае амаль безуважнымі (ох, і даў бы мне выспятка за гэта ганарлівы нобелеўскі лаўрэат!).

Пачатак "Бабы-Ягі" безуважным мяне не пакінуў: *"Гулкий шум в лесу нагоняет сон – / к ночи на море пал сырой туман. / Окружен со всех четырех сторон / Темной осенью островок Буян"*. Зрабіўшы закладку ў кнізе, я ўзбуджана захадзіў па пакоі. Адкуль гэта пазнавальная інтанацыя, гэты знаёмы парадак слоў?

І тут да мяне дайшло – "Машэка"! Верш Уладзіміра Караткевіча пра беларускага паўстанца! Я хуценька адшукаў на паліцы яго зборнік "Матчына душа" і ўпэўніўся, што памяць, з кожным годам усё больш дзіравая, на гэты раз мяне не падвяла. "Машэка" пачынаўся так, быццам Уладзімір Сымонавіч з Іванам Аляксеевічам за адным сталом сядзелі і ў бурымэ гулялі. Ёсць такая літаратурная гульня, калі адзін верш пішацца рознымі паэтамі на зададзеныя рыфмы і загадзя вядомую тэму. *"Лісце алае засыпае роў, / Пушчу чорную апавіў туман. / Атачон з усіх чатырох старон / Золкай восенню мой лясны будан"*.

Бунінская "Баба-Яга" датуецца 1908 годам, караткевічаўскі "Машэка" – 1955-м. Зразумела, хто каму наследаваў і, нібы месяц у сонца, пазычаў паэтычнае святло (з'ява ў сусветнай літаратуры даволі распаўсюджаная).

На жаль, факт гэтай пазыкі-наследавання не быў заўважаны даследчыкамі ні ў папулярным, з накладам 60.000 асобнікаў, 8-томным Зборы твораў Уладзіміра Караткевіча, ні ў акадэмічным 25-томным, які працягвае выходзіць у свет (выйшла ўжо 18 тамоў).

І гэта не дзіўна, бо творчасць Караткевіча – як айсберг: і на паверхні выглядае як гара, але яшчэ большая гара схавана ў глыбіні. А ў глыбіню не кожны даследчык данырне, не кожны мае адпаведны глыбакаводны "скафандр". І ўсё ж маю спадзяванне, што з цягам часу нехта данырне і да грота "Караткевіч і Бунін" ды агледзіць яго з усіх бакоў.

25 тамоў – больш, чым у Якуба Коласа

Увогуле, трэба прызнаць, творчасць Уладзіміра Караткевіча "ў глыбіню" даследавана мала. Але каму тут выстаўляць рахунак? Затузанаму бязглуздымі рэарганізацыямі акадэмічнаму Інстытуту літаратуры, які фактычна прыкрыты яшчэ гадоў дзесяць таму? Караткевічаўскаму музею ў Оршы, які захоўвае мемарыяльныя набыткі, але на даследчыцка-публікатарскую працу не мае ні кадраў, ні рэсурсаў? Ці шматлікім "прынагодным караткевічазнаўцам" пры ўніверсітэцкіх кафедрах, якія паабаранялі кандыдацкія дысертацыі па творчасці пісьменніка, але ні разу не папрацавалі ў ягоным маладаследаваным архіве?

Маладаследаваным – бо аднаго нястомнага і вернага Караткевічу Анатоля Вераб'я ўсё ж недастаткова, каб апрацаваць увесь архіў, адначасова вышукваючы караткевічаўскія тэксты па прыватных зборах і збіраючы пісьменніцкі эпісталярый літаральна па ўсім свеце. І найперш патрэбны ўседлівыя тэкстолагі, якія заняліся б параўнальным аналізам рукапісаў і апублікаваных за савецкім часам твораў, якія няшчадна навечыліся цэнзурай.

Мяркуючы па фальклоры, беларусы – ад прыроды талакоўцы. Згадайма народныя прыказкі: адна пчала мёду не наносіць; адна галавешка і ў печы не гарыць… Але насамрэч – яшчэ як гарыць і другія запальвае! Менавіта дзякуючы таму самаму Анатолю Вераб'ю ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" і пачаў выходзіць згаданы 25-томнік (гэта самы аб'ёмны збор твораў; дагэтуль рэкардсменам быў Якуб Колас, чыя спадчына змясцілася ў 20 тамах). Заўважце: у Караткевіча было 8, а стала 25. Дадалося адразу ажно 17 тамоў!

А там што ні том, то адкрыццё. Скажам, А.Вераб'ём адшуканы караткевічаўскі тэкст да славутага паланэза "Развітанне з Радзімай", напісаны ў далёкім 1965 годзе і з тае пары нідзе не публікаваны. Не трапіла ў папярэднія зборы твораў і ранняя аповесць "Перадгісторыя". У 25-томніку ўпершыню сабраны лісты пісьменніка, яго дарчыя надпісы і малюнкі (іх сабралася ажно 600, на цэлы асобны том).

Як Караткевіча ледзь не абакралі на сяброў

Мяне як чытача парадавала, што ў новым выданні выпраўлена вялікая памылка, якая мела месца ў 1987–1991 гадах, калі выходзіў Збор твораў Караткевіча ў 8 тамах. Каб расказаць пра яе, неабходна зрабіць невялічкае адступленне ў мінулае.

1968 год. У выдавецтве "Беларусь" рыхтуецца да друку паэтычны зборнік Рыгора Семашкевіча "Лесвічоўка". Раптам перад здачай рукапісу ў набор Галоўліт выяўляе ідэалагічную дыверсію – адзін з вершаў прысвечаны студэнту філфака БДУ (Семашкевіч там выкладаў), паэту-пачаткоўцу Алесю Разанаву, які незадоўга перад гэтым разам з Віктарам Ярцам і Лявонам Барташам разварушылі ўвесь філфак, сабраўшы подпісы за выкладанне ўсіх дысцыплін па-беларуску. Зразумела, верш з прысвячэннем цэнзура зняла, а дырэктару выдавецтва накіравалі пальцам за страчаную пільнасць.

Апёкшыся на малацэ, і на ваду дзьмухаць будзеш. Таму любыя прысвячэнні ў наступных кнігах разглядаліся ледзь не пад мікраскопам і пры найменшых сумненнях выдаляліся. Вось тут і трапіў пад раздачу паэтычны зборнік Караткевіча "Мая Іліяда" (1969). У ім было знята ажно дванаццаць прысвячэнняў тым сябрам паэта, якія з афіцыйнага гледзішча не выглядалі ідэйна беззаганнымі. Пад рэдактарскую рэзекцыю трапілі наступныя вершы: "Дзядзькаў кубак" (з прысвячэннем Васілю Сёмуху), "О любоў мая, Беларусь!" (прысвечаны Ларысе Геніюш), "Скарына пакідае радзіму" (прысвячэнне Вячаславу Рагойшу), "Генуэзская крэпасць" (ахвяраваны Уладзіміру Дамашэвічу), "Энкелад" (меў прысвячэнне Валянціну Тарасу), "Балада пра дзіка і чалавека" (тут падазрэнне выклікаў кінааператар Анатоль Забалоцкі, які здымаў з Караткевічам дакументальныя фільмы на Палессі, а пазней – "Каліну чырвоную" В.Шукшына)…

Караткевіч пасля выхаду "Маёй Іліяды" ў свет апынуўся ў непрыемным становішчы. Мне расказваў светлай памяці Васіль Сёмуха, як *"Валодзя на чым свет стаіць лаяў выдавецтва, званіў сябрам і выбачаўся"*. Шляхотны, далікатны Уладзімір Караткевіч, які сваю сяброўскую вернасць засведчыў аўтографам на кнізе, падараванай Міколу Аўрамчыку: *"...ад таго, хто ніколі не падводзіў сяброў і заўсёды ўмеў любіць іх"*.

І як жа добра, што ў 25-томніку ўсе прысвячэнні сябрам акуратна адноўлены. У тым ліку над вершам "О любоў мая, Беларусь!", ахвяраваным Ларысе Геніюш, якую Уладзімір Сымонавіч лічыў сваёй духоўнай маці. Паказальны і той факт, што толькі яму Ларыса Антонаўна даверыла рэдагаванне сваёй кнігі "Невадам з Нёмана" (1967). Пра тое рэдагаванне варта расказаць асобна.

Чым у Зэльве саграваўся Караткевіч

Уладзімір Караткевіч ніколі не працаваў рэдактарам, ён увогуле не служыў ва ўстановах з дакладным працоўным графікам, калі не лічыць непрацяглага настаўнічання пасля заканчэння Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пісьменнік бярог свой час і сваю свабоду. Але Ларысе Геніюш адмовіць не мог.

Калі ў 1966 годзе да яго трапіў рукапіс будучай кнігі, яна яшчэ не мела назвы. Азнаёміўшыся са зместам зборніка, Караткевіч захацеў пабыць не толькі ягоным рэдактарам, але і хросным бацькам. Ён чорным чарнілам упэўнена накрэсліў пасярод старонкі назву – "Айчына". Але Геніюш чамусьці яе не ўпадабала і прапанавала некалькі сваіх – на выбар: "Льняное прадзіва", "Мы – беларусы", "Клёкат бусліны", "З кахання і веры", "Насуперак долі", "Вытканае з зарніц", "Невадам з Нёмана"…

Малюнак Ул.Караткевіча.

Аддамо належнае густу Караткевіча-рэдактара – ён выбраў найлепшы варыянт. І – узяўся за працу. Дзеля ўзгаднення сваіх паправак нават прыязджаў у Зэльву і жыў там цэлы тыдзень. Гасцінная Ларыса Антонаўна аднойчы пачаставала Караткевіча крупнікам – хмельным напоем, які гатавала сама паводле адмысловага рэцэпта. (Вось ён, занатаваны рэдактарам-спажыўцом: 0,5 літра спірту (ці добрай гарэлкі), 0,5 кіпеню, 4 лыжкі мёду разбавіць у кіпені і змяшаць са спіртам, дадаць трохі карыцы, гваздзікі, мускатных арэхаў і духмянага перцу; усё разам варыць 15 хвілін, але не кіпяціць).

Магчыма, мёду не хапіла, і крупніку тым разам было зварана малавата. А рэдактар, відаць, разлічваў на больш шчодры пачастунак за сваю, як сам выказаўся, "катаржную працу".

Паэтка, якая восем гадоў кіркавала вечную мерзлату ў ГУЛАГу, катаржную працу разумела па-свойму. Яна не на жарты засердавала і без доўгіх роздумаў выправадзіла свайго рэдактара з хаты. У Мінску Караткевіч зразумеў, што ляпнуў лішняе, і напісаў у Зэльву прабачальны ліст. Доўга яшчэ Ларыса Антонаўна ў лістах да сяброў згадвала свайго рэдактара-"катаржніка", але ўжо без злосці.

Жадаючы як найхутчэй загладзіць сваю віну, Уладзімір Караткевіч адшукаў у сталічным Батанічным садзе насенне цюльпанаў рэдкага гатунку і паслаў Ларысе Геніюш, чый кветнік быў найлепшым у Зэльве…

Дык а ці строгім рэдактарам быў Караткевіч? Я гартаў падрыхтаваны ім для набору машынапіс і скажу так: рэдагаваў патрабавальна, але не прыдзірліва, часам з аглядкай на Галоўліт. Скажам, выкрасліў радок, дзе Беларусь займала прастору *"ад хваль Угры* (рака на Смаленшчыне. – **М.С.**) *аж па сіні Буг"*, а замест часта ўжыванага паэткай слова *"крывіцкі"* знаходліва падстаўляў зусім не сінонімы *"бясстрашны"*, *"магутны"*, *"тутэйшы"*.

Дзеля справядлівасці варта сказаць, што самыя вялікія скарачэнні ў вершах зроблены не рукой Караткевіча. Больш за сотню радкоў проста да нечытэльнасці затушаваны. Верагодна – цэнзарам, пільнасць якога рэдактар і стараўся якраз прыменшыць, расстаўляючы пад вершамі ваеннай пары даты – 1936, 1938, 1939.

Ларыса Геніюш з разуменнем ставілася да хітрыкаў Караткевіча і давярала яму. Калі кніга "Невадам з Нёмана" выйшла ў свет, сігнальны асобнік прывёз у Зэльву рэдактар. Як потым ён сам успамінаў, *"адагрэўся ў зэльвенскай гасціне душой"*. Відаць, гэтаму паспрыяў і больш шчодра наліваны духмяны крупнік…

«Мой лялькавод – Караткевіч!»

Свабоды і хоць бы шэсць дзясяткаў гадоў жыцця прасіў у лёсу малады Уладзімір Караткевіч. Узамен абяцаўся напісаць сто тамоў, дадаючы ў дужках: пры штодзённай катаржнай працы (усё ж, выходзіць, катаржна працаваць можна не толькі з кіркай, але і з пяром). Сюжэтаў і задум у яго было столькі, што ён жартам прапаноўваў іх сябрам на продаж. Але чаго вартыя былі б самыя арыгінальныя задумы без караткевічаўскай неўтаймоўнай фантазіі, без яго вобразнага бачання свету, без усяго таго, што з часавай адлегласці звычайна абазначаецца адным словам – геній.

Караткевіч зрабіў вельмі шмат. 25 тамоў за 25 гадоў сталай творчай працы – гэта, несумненна, творчы подзвіг. Усё напісанае пісьменнікам – гэта невычарпальная крыніца нацыянальнага аптымізму, недахоп якога заўважна адчуваецца ў нашым зняверанам грамадстве. У наш змрочны час трэба проста чытаць і перачытваць яго творы, мець у душы радкі-скрыжалі *"На Беларусі Бог жыве"* ці: *"Бог пайшоў, жыццё ідзе пад кручу, / Ты ж ідзі і не губляй спакой. / Ёсць замест прыватнай неўміручасці / Неўміручасць нацыі тваёй"*. Гэта не тэарэмы. Іх не трэба даказваць. Гэтыя словы проста трэба часцей паўтараць – наўслед за Караткевічам, які ў самыя беспрасветныя савецка-імперскія часы называў Беларусь Краінай (менавіта з вялікай літары).

Чытаючы яго жыццялюбныя творы, увабраўшы іх у сэрцы, беларусы застануцца народам. Пры любой уладзе. Усцешна, што гэта разумее моладзь. На адным з нядаўніх пратэстных маршаў над галовамі тысяч людзей я пабачыў транспарант: *"Мой лялькавод – Караткевіч!"*. На душы адразу палягчэла. З такім вядоўцам мы абавязкова дойдзем да той Беларусі, за якую змагаліся нашы папярэднікі, за якую і сёння самаахвярна змагаецца наш народ. Пад бел-чырвона-белым сцягам і Пагоняй, якія нязменна прысутнічаюць на малюнках Уладзіміра Караткевіча.

Міхась СКОБЛА.

СІТУАЦЫЯ

«За 80 дзён – ніводнага следчага дзеяння з маім удзелам…»

***Марыя Калеснікава**, якая ўзначальвала штаб прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду Віктара Бабарыкі, а зараз знаходзіцца ў ізалятары ў Жодзіне, паведаміла пра чарговы ціск, які на яе пайшоў.*

Як стала вядома, больш за тры тыдні не задавальняюць запыт на сустрэчу Марыі з начальнікам медыцынскай часці па пытаннях стану здароўя.



Таксама Калеснікава перадала на волю свой каментарый з нагоды таго, што адмаўляюцца ўзбуджаць крымінальную справу з нагоды яе выкрадання ў верасні гэтага года.

"Былі выкраданне, утрыманне, пагрозы жыццю і здароўю, спроба гвалтоўнай дэпартацыі, але крымінальная справа па факце гэтых злачынстваў у дачыненні да мяне так і не заведзена, – кажа Марыя. – *Да гэтага часу няма вынікаў судова-медыцынскай экспертызы, якая праведзена 21 верасня. Ніводнага следчага дзеяння з маім удзелам так і не праведзена за ўсе 80 дзён з моманту выкрадання і па сённяшні дзень* (інфармацыя датавана 26 лістапада. – **Рэд.**).

Законы не працуюць, сістэма не працуе!"

Таксама паплечнікі **Марыі Калеснікавай** паведамілі, што днямі ў Жодзінскім ізалятары ў яе забралі тры кнігі – "Сусвет Стывена Хокінга" і дзве кнігі Ювала Харары – "21 урок для XXI стагоддзя" і "Homo Deus".

"У ізалятары ў Жодзіне і так вялікія праблемы з бібліятэкай і літаратурай ў ёй, – кажуць сябры Марыі. – *Кнігі, якія перасылалі ў бібліятэку, таксама не ўзялі. Іх проста аддалі на склад і не выдаюць.*

А зараз абсалютна эпічны выпадак – выдадзеныя Марыі Калеснікавай кнігі забралі проста з яе камеры. Калі гэта не прамы ціск на Марыю, то што тады?"

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СУД

Оправдать и компенсировать!

Суд Московского района Минска постановил взыскать в пользу главного инженера МЗКТ **Андрея Головача** компенсацию морального вреда на сумму 40 тысяч рублей, хотя в иске было заявлено 50 тысяч.

Головач провел в СИЗО почти три года и был оправдан, сообщает *TUT.BY*. Деньги на компенсацию Минфин выделит из бюджета.

СЛЫШАЛИ?

Коронавирус внес коррективы в автопробег

Белорусская команда «МАЗ-СПОРТавто» примет участие в мировом ралли-рейде «Дакар-2021».

Гонка стартует 3 января в Джидде и завершится там же 15 января. Спортсменов ожидает 12 этапов с днем отдыха в Хаиле. Из-за карантина пришлось отказаться от планов привести караваны в Египет и Иорданию.

В команде «МАЗ-СПОРТавто» отметили, что на «Дакар-2021» сильно повлияла эпидемиологическая ситуация в мире. Многие команды сократили число экипажей, а некоторые и вовсе пропустят соревнование.

Ранее мазовская команда дважды становилась призером «Дакара». Так, в 2018 году белорусы привезли в Минск «серебро», а в 2020-м вошли в первую тройку.

Сергей ЗАБЛОЦКИЙ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЛІСТАПАДА 2020 г.

ТАМ, ЗА КРАТАМІ

Вольга СЕВЯРЫНЕЦ: «7 снежня будзе паўгода, як Паша не бачыў Францішка...»



Вольга Севярынец, жонка палітвязня, распавяла "Народнай Волі", што Павел у СІЗА зараз рыхтуе хрысціянскія віктарыны і просіць тых, хто піша яму лісты, падкідваць цікавыя факты аб беларускіх хрысціянах у спорце, навуцы, эканоміцы, архітэктуры, музыцы і кіно.

Палітык адказвае на ўсе лісты, і, калі камусьці карэспандэнцыя не прыходзіць, гэта значыць, што ліст альбо не прайшоў цэнзуру, альбо яго проста выкінулі. Штодзённа Павел атрымлівае 10–15 лістоў.

– *На днях быў выдадзены новы наклад энцыклапедыі Паўла "Люблю Беларусь"*, – дадае Вольга Севярынец. – *А пару тыдняў таму ўзламалі яго тэлеграм-канал, што можа сведчыць пра зрухі ў справе. Магчыма, хутка пра нешта новае даведаемся.*

Паша – мой нязломны рыцар, але чытаю між радкоў, як ён хоча хутчэй да сваіх. Ужо больш за тры месяцы ён на Валадарцы і амаль столькі ж быў на Акрэсціна. 7 снежня будзе паўгода, як Паша не бачыў сына Францішка, піша, што мы снімся яму кожную ноч.

Кажуць, што Бог не дае выпрабаванняў звыш сілы, тады для мяне гэта выпрабаванне на мяжы сіл. Адзінае, што трымае, гэта Ісус Хрыстос, родныя, сябры і настойлівыя беларусы, якія ўмеюць здзіўляць.

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Топавы матч пройдзе без гледачоў...

28 лістапада пройдзе апошні тур чэмпіянату Беларусі па футболе, які і высвеліць, хто будзе з медалямі і якой вартасці.

Гэтае першынство адметнае тым, што да апошняга тура на медалі прэтэндуюць адразу шэсць каманд: барысаўскі БАТЭ (29 гульняў, 57 ачкоў), салігорскі "Шахцёр" (29/56), гродзенскі "Нёман" (29/53), "Тарпеда-БелАЗ" з Жодзіна (29/53), "Дынама" (Брэст) (29/51) і "Дынама" (Мінск) (29/51).

Дарэчы, стала вядома, што топавы матч тура паміж сталічным "Дынама" і БАТЭ пройдзе на стадыёне "Дынама" абсалютна без гледачоў *"у сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй, якая склалася, а таксама паводле рэкамендацый мясцовых органаў улады"*.

Напэўна, у гэтай сітуацыі апошняе слова сказаў зусім не каранавірус, а тыя самыя "мясцовыя органы ўлады", якія, хутчэй за ўсё, вырашылі перастрахавацца і не пусціць на арэну балельшчыкаў БАТЭ і "Дынама", якіх ідэалагічна надзейнымі ніяк не назавеш. Могуць і якую-небудзь акцыю правесці на трыбунах, таму і ўспомнілі пра каранавірус.

Дарэчы, матчы з удзелам хакейнага "Дынама" праводзяцца на "Мінск-Арэне" ў закрытым памяшканні, і там ніхто не думае забараняць уваход балельшчыкам на арэну "ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй, якая склалася".

Але, як бы там ні было, ужо ў гэтую суботу мы даведаемся імя новага чэмпіёна (*брэсцкае "Дынама" свой мінулагодні поспех ужо дакладна не паўторыць.* – ***Аўт.***), а таксама прызёраў першынства.

Вось расклад матчаў апошняга тура: "Славія" (Мазыр) – "Энергетык-БДУ" (Мінск), "Дынама" (Мінск) – БАТЭ (Барысаў), "Дынама" (Брэст) – "Нёман" (Гродна), "Іслач" (Мінскі раён) – "Гарадзея", "Віцебск" – "Тарпеда-БелАЗ" (Жодзіна), "Шахцёр" (Салігорск) – "Мінск", "Белшына" (Бабруйск) – "Рух" (Брэст), "Слуцк" – "Смалявічы".

Усе гульні пачнуцца ў 14.00.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ШАШКІ

Творы гасцей

Прапануем самастойна знайсці выйгрыш за белых у прыведзеных ніжэй праблемах.

Аўтар №№1–4 – **Ншан Алывердзян** з Ерэвана. Праблемы №№1–2 дадзены ў апрацоўцы вядучага рубрыкі.

№1 **Белыя**: a3, b2, d4, f4, e5, g5, f6 (7).
Чорныя: d2, f2, a5, c7, e7, d8, h8 (7).

№2 **Белыя**: a1, b2, c5, d6, g7 (5).
Чорныя: a3, e3, g3, f4, g5 (5).

№3 **Белыя**: d2, e3, b4, f4, a5, a7 (6).
Чорныя: h2, a3, g3, d6, f6, d8 (6).

№4 **Белыя**: g3, b4, d4, f4, a5, c5, e5, g5 (8).
Чорныя: b2, h2, h6, a7, e7, f8 (6).

Далей прапануем творы адэсіта **Сяргея Губачкіна**.

№5 **Белыя**: e3, g3, f4, b6, d6, c7 (6).
Чорныя: h2, a3, c3, e5, f6, e7, f8 (7).

№6 **Белыя**: b4, d4, a5, c5, e5, d6, c7 (7).
Чорныя: b2, d2, f2, e3, g3, f4, f8 (7).

№7 **Белыя**: d4, g5, d6, f6, h6, e7 (6).
Чорныя: d2, f2, e3, b4, h4, c5, b6, f8 (8).

№8 **Белыя**: h2, d4, f4, h4, e5, g5, b6, a7 (8).
Чорныя: d2, f2, a3, e3, g3, c5, h6, g7, d8 (9).

Міжнародныя дамачныя праблемы

№9–11 прапануе чэмпіён свету ў гэтым жанры **Рыгор Краўцоў** (г.Круглае Магілёўскай вобл.).



№9 (гл.дыяграму) **Белыя**: шашкі 9, 10, 14, 32, 33, 35, 38, 40, 49, дамкі 27, 47 (11).
Чорныя: шашкі 8, 11, 17, 23, 24, 36, 41, 44, дамкі 15, 19, 25 (11).
13, 16, 30, 40, 21(37**A**), 26(5**B**), 31, 46 x. **B**(10), 37, 5 x. **A**(5), 8, 31, 46 x.

№10 **Белыя**: шашкі 8, 11, 38, 43, 44, дамкі 1, 3, 7, 42 (9).
Чорныя: шашкі 2, 5, 10, 13, 19, 22, 27, 29, 45, дамкі 34, 47, 49 (12).
26, 38, 21, 18, 18, 10, 6 x.

№11 **Белыя**: шашкі 19, 30, 32, 33, 38, 39, 41, 42, 43, 45, дамка 37 (11).
Чорныя: шашкі 10, 11, 18, 20, 21, 25, 34, дамкі 17, 22, 50 (10).
40, 33-28, 28, 38-32, 28, 37-23, 5, 6 x.

Далей прыводзяцца творы вядучага рубрыкі.

№12 **Белыя**: шашкі 33, 34, дамка 47 (3).
Чорныя: шашкі 7, 8, 9, 10, 17, 18, 20, 25, 35, 43 (10).
30(34**A**), 29, 49 x. **A**(24),29, 48 x.

№13 **Белыя**: шашкі 19, 20, 24, 29, 42, дамка 35 (6).
Чорныя: шашкі 9, 15, 17, 31, 41, дамка 30 (6).
37(32), 19-14(5), 23(24**A**), 28(9-14**B**), 46(10), 19, 5 x. **B**(10), 46, 3 x. **A**(28), 49, 36 x.

№14 **Белыя**: шашкі 19, 20, 24, 29, 42, дамка 19 (6).
Чорныя: шашкі 5, 15, дамка 30, 35 (4).
2(41**A**), 29-24(19**B**), 35, 46 x. **B**(8), 46, 23 x. **A**(46), 29-24, 24(5-10**CD**), 35, 5 x. C(46-10),33/47, 4 x. **D**(41),35, 46 x.

Закончым знаёмства з творамі нашых аўтараў у гэтым выпуску складанымі для рашэння канцоўкамі выдатнага мінскага майстра **Валерыя Свізінскага.**

№15 **Белыя**: a1, e1, g1, d2, f2, b4, a5, a7 (8).
Чорныя: a3, d4, c5, e5, d6, f6, b8 (7).
fe3, g3(ed4), c3, c3(fe5), f4, d4, h2, d2(e5**A**), b6(b4**B**), c7, b8(a3), a7(f4), c3(b2, g3), b2(h2), c3(g1), cd4 x. **B**(f4, g3), e3(h2), c5(c7), d4(b6), d6(a5), e7(b4), f8(a3), b8(b2), g3, e5, c1 x. **A**(d4), b6(c5), c7, b8(e5), g3(b4), f2(dc3), e1(b2), c3 x.

№16 (гл.дыяграму) **Белыя**: c1, f4, a5, g5, b6, d6, c7 (7).
Чорныя: a3, c3, b4, d4, h6, a7, f8 (7).
b8, a7 (e3), g1 (ab2, f6,b4), g5, h2 (e3), g1 (ed2), d4 x.

Супаставім рашэнні

"Народная Воля" за 1 кастрычніка 2020 года.

№1 – cd8, b4, ab6, h6x.
№2 – cd8, f8, b6, h4x.
№3 – b8, b4(d6**A**), a3, b2(h6), c3x. **A**(a5), f4, h6x.
№4 – ab8, e7, d8, f2, b6, e1, (h4), f4x.
№5 – ab8, d8, d6, h6, a5x.
№6 – f2, g3, gf4, f8(c3**A**), g7(ab2), ed4x. **A**(c7), g7(d6), f4(c5), fe5(b2), d6x.
№7 – c3, e7(f:b4), f4 (прыватнае пабочнае рашэнне – h6, f2, g3 x.), b8, g3, f2x.
№8 – b4, c3, g3, f8, f4, b8, d6 (d4), c5x.

Адказы даслалі: **Эдуард Дамброўскі, Віталь Варушыла, Іван Наўроцкі** (Мінск), **Уладзімір Бандарык** (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), **Леанід Жыхар, Фёдар Карпей** (Мядзел), **Ігар Ананіч** (Гродна), **Сяргей Бурко** (Орша). Дзякуем за лісты і спадзяёмся на вашу далейшую актыўнасць!

Свае лісты дасылайце на адрас: ***220030 Мінск, вул. Энгельса, 34а, "Шашкі"*** – або на электронны адрас рэдакцыі: ***shulga.checkers@gmail.com***.

Віктар ШУЛЬГА,
міжнародны майстар спорту.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!

Как правильно принимать чеснок, чтобы он принес пользу

В народной медицине существует множество рецептов природных средств, в которых каждый компонент усиливает и продлевает действие главного ингредиента – чеснока. Ниже представлены самые популярные способы его употребления. Но необходимо помнить: несмотря на то, что эти средства изготавливаются из натуральных и общепризнанно полезных продуктов, могут быть противопоказания к их применению, поэтому, прежде чем принимать их, следует посоветоваться с врачом.

На каждый день

Тем, у кого нет медицинских противопоказаний, народная медицина рекомендует ежедневно съедать по 2–3 дольки чеснока. Считается, что антихолестериновый эффект наблюдается уже после употребления 0,5 дольки в день.

Если использование цельного продукта вызывает неприятные вкусовые ощущения, чеснок можно добавлять в любые салаты. В этом случае также отмечен положительный эффект в борьбе против холестерина (снижение его уровня на 10% через 30 дней диеты).

Альтернативой может стать чесночный порошок или сок, выжатый из соответствующего количества долек. Средство отлично сочетается с любыми овощами, его можно добавлять в растительные масла.

Состав с хреном

Смешать 250 г измельченных в блендере лимонов (вместе с кожурой), растолченный чеснок (5 головок) и натертый корень хрена (100 г).

Ингредиенты смешать, и полученную массу залить 400 мл воды. Средство должно отстояться в холодильнике в течение 10 часов. Принимать нужно по 2 ст. ложки 3 раза в сутки за полчаса до приема пищи. Продолжительность курса – не более 10 дней.

Целебный эликсир

Для приготовления нужно:

1 головка чеснока;

500 мл оливкового масла (обязательно нерафинированного);

1 ст. ложка поваренной соли.

Дольки чеснока измельчить с солью, к массе добавить масло.

Отстаивать полученную смесь необходимо в течение 14 дней в темном месте, каждые 1–2 дня встряхивая.

После истечения указанного времени раствор перелить в бутылку и хранить в холодильнике.

Как правильно пить настой? Принимается он по 2 чайные ложки 3 раза в сутки перед едой. Лечение следует осуществлять в течение 1 месяца, затем сделать перерыв на 10–15 дней, и снова 30 дней терапии.

Спиртовая настойка

Потребуются:

150 г очищенного чеснока, истолченного в ступке из стекла или фарфора;

150 мл 40-процентного этилового спирта.

Компоненты нужно смешать и перелить в стеклянную емкость. Плотно закрыть и дать настояться в течение 10 суток в прохладном темном месте. Хранение в холодильнике не допускается.

Спустя полторы недели следует процедить раствор через марлю и принимать 3 раза в день за 30 минут до еды. Объем следует постепенно увеличивать: в первый день – 1 капля, затем добавлять по 1 капле в сутки, пока их количество не достигнет 15. Курс терапии продолжается до полного расходования настойки.

Лимонно-медово-чесночная настойка

Необходимо отжать 500 мл сока лимона и смешать с 3 мелко порезанными головками чеснока и 200 г меда. Смесь должна настаиваться около 15 дней в стеклянной таре.

Затем нужно процедить раствор и принимать по 1 чайной ложке 2 раза в день, запивая 200 мл простой воды. Длительность курса – 1 месяц. Повторное лечение можно проводить через год.

Тибетский рецепт

Тибетский метод предполагает употребление настойки чеснока на спирту по специальной схеме.

Для приготовления настойки необходимо взять 350–400 г свежего чеснока, измельченного до получения однородной кашицы. Смесь поместить в стеклянную емкость, плотно закрыть крышкой и поставить в темное прохладное место на 1 сутки.

Затем следует выбрать из нижних слоев около половины наиболее «сочной» мякоти, остальное выкинуть.

Залить чесночную массу 200 мл 96-процентного спирта. Если нет спирта такой концентрации, можно использовать обычную водку, но дозу придется увеличить в 2 раза.

После всех проведенных манипуляций смесь снова убрать в темное место и настаивать 10 суток. После этого необходимо отжать состав, полученную жидкость опять убрать в прохладное место еще на 3 дня.

Эликсир принимают по каплям, растворяя их в 50 мл молока или воды, нормальной комнатной температуры. Делают это ежедневно, натощак за полчаса до приема пищи.

ИССЛЕДОВАНИЯ

Коронавирус: потеря обоняния и вкуса отличается от обычной простуды и гриппа

Об этом с уверенностью заявляют теперь европейские исследователи, изучившие опыт пациентов, переживших коронавирус, и опубликовавшие результаты своей работы в журнале *Rhinology*.

При COVID-19 потеря обоняния бывает мгновенной и практически полной. При этом таких симптомов, как забитый нос или сильный насморк, обычно не наблюдается: чаще всего больные коронавирусом могут свободно дышать (проблемы с легкими – это отдельная история).

К этому следует добавить и потерю вкуса. Причем потерю реальную: у больных не просто изменяются вкусовые ощущения в связи с потерей обоняния, что было бы вполне объяснимо, а они напрочь его теряют, так, что не в состоянии отличить сладкое от горького.

Специалисты подозревают, что вирус непосредственно действует на нервные клетки, отвечающие за восприятие вкуса и запаха.

Простой анализ

В ходе исследования руководитель группы из Университета Восточной Англии профессор **Карл Филпот** отобрал группу из 30 добровольцев: десять были больны коронавирусом, еще десять страдали от простуды, и последняя десятка было совершенно здорова.

У пациентов с COVID-19 потеря обоняния наблюдалась особенно ярко. Они с трудом различали запахи и вовсе не могли отличить сладкое от горького.

«Похоже, и в самом деле имеются характерные признаки, отличающие коронавирус от других респираторных заболеваний, – полагает профессор Филпот. – *А это очень важно, поскольку тестирование на обоняние и вкус помогло бы отличать пациентов с коронавирусом от тех, кто болен обычными гриппом или простудой».*

По словам профессора, люди могли бы сами успешно проводить такие тесты в домашних условиях, используя подручные продукты вроде кофе, чеснока, лимона и сахара.

При этом он подчеркивает, что при подозрении на коронавирус обычный тест, при котором берутся пробы из носа и горла, по-прежнему необходим.

Кстати, у большинства пациентов, переболевших коронавирусом, обоняние и вкус возвращаются в норму через несколько недель.

Все дело в носу?

Чтобы понять биохимический механизм потери обоняния, профессор **Эндрю Лэйн** из Университета Джонса Хопкинса решил заглянуть поглубже в носы пациентов и сделал там одно важное открытие, результаты которого были опубликованы в издании *European Respiratory Journal*.

Профессор Лэйн с коллегами обнаружил в зоне, отвечающей за обоняние, чрезвычайно высокую концентрацию фермента АПФ-2 (это ангиотензин-превращающий фермент 2, или цинксодержащий металлофермент). Этот фермент, по мнению ученых, служит своеобразными воротами, позволяющими коронавирусу проникать в клетки организма и вызывать заражение.

«Сейчас мы проводим дополнительные лабораторные эксперименты, чтобы выяснить, в самом ли деле вирус использует эти клетки для проникновения в человеческий организм и его заражения, – поясняет профессор Лэйн. – *Если это и в самом деле так, мы могли бы справиться с этой инфекцией посредством антивирусной терапии, проводя лечение непосредственно через нос».*

(Би-би-си.)

К СВЕДЕНИЮ

Почему яйца считают продуктом, способным уберечь легкие от COVID-19

В период пандемии обязательно нужно включать в свой рацион яйца.

Дело в том, что белок яйца участвует в построении иммуноглобулинов, которые помогают противостоять инфекциям.

Как пояснили ученые, желток яйца также полезен. Микроэлементы, входящие в его состав, поддерживают местный иммунитет и обеспечивают организм кислородом.

Яйца, как и другие продукты, богатые животными жирами, нельзя исключать из рациона в период пандемии. Отсутствие жиров в рационе ведет к клеточной гипоксии, ведь иммунные клетки состоят именно из жиров. К тому же яйца богаты витаминами А и Е, которые стимулируют выработку иммунной системой натуральных «клеток-киллеров» и обладают мощным антиоксидантным свойством.

Также для защиты организма от ковида ученые рекомендовали употреблять больше жирной рыбы и оливкового масла.

Светлана ПРОТАС.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ